## 2025 г. – 80 гадоў з часу стварэння аддзела дзяржаўнай аўтаінспекцыі Кобрынскага РАУС (1945)




Гісторыя Дзяржаўтаінспекцыі - гэта слаўны шлях, поўны гераічных будняў. У 1935 годзе аўтамабільны аддзел Цэнтральнага Упраўлення дарог і транспарту пры Саўнаркоме СССР быў перайменаваны ў Дзяржаўтаінспекцыію. З мэтай пашырэння функцый ДАІ, перш за ўсё ў забеспячэнні дарожнага руху, пастановай Саўнаркома СССР ад 3 сакавіка 1936 года яна была ўключана ў састаў Галоўнага Упраўлення рабоча-сялянскай міліцыі НКУС СССР, а 3 чэрвеня было зацверджана Палажэнне аб Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі. Іменна гэтую дату і прынята лічыць днём утварэння ДАІ, так як яе задачы таго часу вызначалі асноўныя накірункі дзейнасці цяперашняй Дзяржаўтаінспекцыі.

Але станаўленне і развіццё службы праходзіла ў асноўным у пасляваенныя гады і фарміравалася яна як састаўная частка міліцыі. ДАІ стала адной з самых мабільных, высокаарганізаваных і эфектыўных аддзяленняў органаў унутраных спраў і вырашала задачы не толькі ў сферы бяспекі дарожнага руху, але і ў ахове грамадскага парадку. З-за вялікага аб’ёму работы і малакольнаснага штату інспекцыя абапіралася на дапамогу грамадскасці. Былі створаны шматлікія спецыялізаваныя народныя дружыны. У гэты час у ДАІ пачалі фарміравацца службы арганізацыі дарожнага руху, спецыялізаваныя рэгістрацыйныя падраздзяленні, службы прапаганды і агітацыі, экалагічныя групы і г. д.

Гісторыя Кобрынскай дзяржаўтаінспекцыі бярэ пачатак з чэрвеня 1945 года, калі ў штат раённага аддзела міліцыі была ўведзена пасада аўтаінспектара. У 1945-1947 гадах гэту пасаду займаў былы франтавік Міхаіл Сямёнавіч Пугачоў. У той час у Кобрыне было ўсяго два аўтамабілі - грузавы «Сітраэн» у прамкамбінаце і легкавы «Форд» - у дарожна-эксплуатацыйным участку. Сам жа аўтаінспектар ездзіў на веласіпедзе.

У 1960 годзе ў Кобрынскай міліцыі было створана аддзяленне ДАІ, якое ў свой час узначальвалі І. Н. Камароў, С. А. Гаманчук, С. А. Ананьеў, В. М. Жукаў, С. І. Сарачук, В. К. Гамянюк. У 1975 годзе ў аддзяленні ДАІ налічвалася восем чалавек, у распараджэнні якіх быў аўтамабіль і два

матацыклы. Тэхнічная забяспечанасць службы ДАІ у 1998 годзе ужо складала восем легкавых аўтамабіляў, у тым ліку перасовачны наркалагічны пункт, розныя кантрольна-вымяральныя прыборы, сродкі сувязі.

У 2011 годзе Кобрынскае аддзяленне ДАІ было рэарганізавана ў аддзел ДАІ Кобрынскага РАУС, куды ўвайшло і падраздзяленне МРЭА (сёння абслугоўвае г. Кобрын, а таксама населеныя пункты Кобрынскага, Жабінкаўскага, Маларыцкага, Драгічынскага раёнаў).

Спецыфіка і выкананне пастаўленых задач адрознівае супрацоўнікаў ДАІ тым, што іх дзейнасць накіравана на бяспеку дарожнага руху, а сюды ўваходзяць яго арганізацыя і прафілактыка дарожна-транспартных правапарушэнняў. Дзяржаўтаінспектары ажыццяўляюць тэхнічны нагляд за аўтатранспартнымі сродкамі і арганізацыяй дарожнага руху, вядуць адміністрацыйнае справаводства, дазнанне па фактах дарожна-транспартных здарэнняў, імкнуцца падтрымліваць парадак на дарогах, забяспечваць строгае захаванне правілаў дарожнага руху. Наладжана цеснае ўзаемадзеянне з кіраўніцтвам райвыканкама, эфектыўна функцыянуе камісія па бяспецы дарожнага руху пад кіраўніцтвам намесніка старшыні РВК. Акрамя патрулявання вуліц і прафілактычнай работы, выкарыстоўваецца платформа рэспубліканскай сістэмы маніторынгу грамадскай бяспекі (РСМГБ), якая аб'ядноўвае камеры назірання, датчыкі, цэнтры апрацоўкі даных і праграмнае забеспячэнне для відэааналітыкі, а гэта дае магчымасць аператыўна рэагаваць на правапарушэнні. Актыўна праводзіцца работа па прапагандзе бяспекі паводзін людзей на дарозе, асабліва сярод дзяцей.

Сумленнае выкананне абавязкаў, мужнасць і рашучасць у барацьбе са злачыннасцю, высокі прафесіяналізм характэрны для многіх супрацоўнікаў Кобрынскага ДАІ. Пры выкананні свайго службовага абавязку загінулі інспектары ДПС ДАІ У. Р. Прудзіч і А. І. Селівончык. Шмат супрацоўнікаў маюць дзяржаўныя ўзнагароды. В. С. Пятручык узнагароджаны знакам «Выдатнік міліцыі», медалямі «За бездакорную службу III ступені», «За ўдзел у ліквідацыі Чарнобыльскай аварыі». Працоўныя заслугі В. К. Гамянюка адзначаны двума медалямі «За бездакорную службу», шматлікімі Граматамі і заахвочваннямі. Мае медалі «За бездакорную службу» і «80 гадоў Савецкай міліцыі» Г. І. Манішэўскі.

У аддзяленні ДАІ Кобрынскага РАУС нямала ветэранаў, якія свой багаты вопыт передаюць маладому папаўненню, вучаць сваіх маладых калег добрасумленнаму выкананню службовага абавязку. З 2024 года начальнікам аддзела ДАІ Кобрынскага РАУС з'яўляецца Андрэй Мікалаевіч Ігнацюк.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2025 г. Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна,
бібліёграф І кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Корниевич, Н.** Первичная организация ветеранов Коринского РОВД / Н. Корниевич // Главное **–** сердцем не стареть : к 25-летию Белорусской общественной организации ветеранов органов внутренних дел и внутренних войск. – Минск, 2016. – С. 158-163 : фот.

**Съедин, С. А**. Кобринские традиции / С. А. Съедин // У хорошего полководца нет плохих солдат : очерки о белорусской милиции. – Минск, 2002. – С. 3-11.

**Чубаров, Б. Н.** На службе людям : в ознаменование 75-летия образования Кобринского РОВД : [биографические очерки о сотрудниках Кобринской милиции, рассказы] / Б. Н. Чубаров. - Брест : Альтернатива, 2014. - 163 с. : ил., портр.

См. на с. 34-37, 38-40.

**Андросова, О.** На страже дорожного порядка / Ольга Андросова ; фото Ирины Омельянчук // Кобрынскі веснік. - 2025. — 12 ліпеня (№ 28). — С. 6 : фот.

Начальник ОГАИ Кобринского РОВД Андрей Игнатюк рассказал о своей работе.

**Андросова, О.** Рыцарь дорог / Ольга Андросова ; фото Ирины Омельянчук // Кобрынскі веснік. - 2025. — 1 сакавіка (№ 9). — С. 6 : фот.

Об инспекторе дорожно-патрульной службы ОГАИ Кобринского РОВД Иване Шпендике.

**Дашкевич, В. П.** ГАИ проведет кардинальные изменения / [Виталий Дашкевич ; беседовала] Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2018. — 18 января. — С. 6.

Беседа с начальником ОГАИ Кобринского РОВД В. Дашкевичем.

**Дашкевич, В.** "На дороге должно быть комфортно всем!" / Виталий Дашкевич ; [беседовал] Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2017. — 19 красавіка. — С. 4.

Беседа с начальником отдела ГАИ Кобринского РОВД В. Дашкевичем.

**Полетило, А.** Итоги года. На дорогах Кобринщины / Полетило Александр // Кобрынскі веснік. - 2017. — 14 студзеня. — С. 3.

За 2016 год на территории Кобринского района совершено 34 дорожно-транспортных происшествия.

**Савчук, М.** Письмо водителю / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2017. — 28 сентября. — С. 6.

Сотрудники ГАИ Кобринского РОВД совместно с учащимися школ города и района провели профилактическую акцию "Письмо водителю".

**Осипенко, В**. "Порядок на дорогах - задача общая" / Василий Осипенко ; [беседовал] Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2016. - 22 чэрвеня. - С. 6.

Начальник ОГАИ ОВД Кобринского райисполкома В. Осипенко рассказал о ситуации на дорогах города и района.

**Осипенко, В.** Начальник ГАИ: "Во главу угла будет поставлена профилактика" / [Василий Осипенко ; беседовала] Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2016. — 9 июня. — С. 6.

В гостях у газеты "Кобрин-информ" - начальник ОГАИ В. Осипенко.

**Бычковский, С.** Аварийность на Кобринщине сократилась / [Сергей Бычковский ; беседовала] Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2016. — 4 февраля. — С. 6.

Результаты работы Кобринского РОВД в рамках Концепции обеспечения безопасности дорожного движения.

**Бычковский, С**. Безопасность на дорогах — задача реальная / Сергей Бычковский // Кобрынскі веснік. - 2016. — 20 студзеня (№ 6). — С. 6 : фот.

Госавтоинспекция Кобринского РОВД проводит полный комплекс мероприятий в целях повышения безопасности дорожного движения.

**Белов, Д.** Улыбка водителя. О движении без нарушений и байкерском этикете. Алкоголь доведет до конфискации / Дмитрий Белов, Людмила Пашкович, Петр Тимошенко ; фото авторов // Кобрынскі веснік. - 2014. — 5 ліпеня. — С. 10.

**Бычковский, С. Н.** Пешеходные переходы стали небезопасными / [С. Н. Бычковский ; беседовала] Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2014. — 27марта. — С. 6.

Начальник Госавтоинспекция Кобринского РОВД С. Н. Бычковский – о профилактической работе.

**Поливода, Д**. В ответе взрослые / [Дмитрий Поливода ; беседовал] Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2014. — 26 лістапада. — С. 3.

Госавтоинспектор ОГАИ РОВД Д. Поливода – о детском травматизме на дорогах района.

**Савчук, М.** Всю жизнь на дороге / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2014. — 2 июля. — С. 6.

Ко Дню образования ГАИ - об инспекторах ДПС Кобринского ГРОВД.

**Савчук, М.** Кто помог "сбитому пешеходу"? / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2013. — 31 октября. — С. 11.

23 октября сотрудники ГАИ Бреста и ОГАИ Кобринского РОВД проводили эксперимент, проверяя сознательность водителей.

**Сидюк, А. Н.** Судебные исполнители и сотрудники ГАИ: каждый в поиске своих "клиентов" / А. Н. Сидюк // Кобрин-информ. - 2013.— 29 августа. — С. 6.

Во время рейдов сотрудники Госавтоинспекции совместно с судебными исполнителями будут находить своих "клиентов".

**Савчук, М.** Стражи дорог всегда на посту / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2013. — 28 февраля. — С. 5.

Отдел ГАИ Кобринского РОВД признан лучшим в области.

**Бяспечная** дарога // Кобрынскі веснік. - 2012. – 25 жніўня. - С. 4.

Старонка ДАІ.

**За безопасность** - с ранних лет : Бяспечная дарога // Кобрынскі веснік. - 2012. - 30 чэрвеня. - С. 10.

Об акциях ГАИ Кобринского РОВД за безопасность движения.

**Занько, Н.** Дзень без аўтамабіля на веласіпедах / Настасся Занько // Кобрынскі веснік. - 2011. - 28 верасня. - С. 4.

Па ініцыятыве ДАІ у Дзень без аўтамабіля адбыўся велапрабег па вуліцам Кобрына.

**Заяц, С.** Ошибок дорога не прощает / С. С. Заяц // Кобрин-информ. - 2011. - 27 октября. - С. 4.

Сотрудники ГАИ проводят операцию «Пешеход».

**Савчук, М.** Незабываемая встреча ветеранов ГАИ / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2010. - 8 июля. - С. 4.

**Пешко, Ю. Н**. Не нарушай, будь благоразумен : Закон и порядок / Ю. Н. Пешко // Кобрин-информ. - 2008. - 17 июля. - С. 4.

Деятельность ГАИ Кобринского РОВД по предупреждению ДТП.

**Толковец, О.** На страже чистоты и порядка / О. Толковец // Кобрынскі веснік. – 2005. – 25 студзеня. – С. 7.

О группе экологического надзора отделения ГАИ.

**Сацук, А.** Дзяржаўтаінспекцыі – 65 гадоў / матэрыялы старонкі падрыхтавалі А. Сацук і А. Шугай (фота) // Кобрынскі веснік. – 2001. – 7 ліпеня (№ 55). – С. 2 : фат.

**Бездакорна** служыць свайму народу // Кобрынскі веснік. – 1998. – 1 ліпеня (№ 51). – С. 2.

Дзяржаўтаінспекцыі – 62 гады.

**О сотрудниках** отделения ГАИ Кобринского РОВД Ю. А. Киричук и Ф. А. Марчук // Заря. – 1993. – 18 февраля. – С. 3.

**Астаповіч, А.** Сход грамадскіх аўтаінспектараў / А. Астаповіч // Камуністычная праца. – 1973. – 19 красавіка.

***Рэгіён:***

Кобрынскі раён

Кобрын

***Установы:***

Кобрынская ДАІ

***Прадметы:***

Міліцыя

Дзяржаўтаінспекцыі